# СЯДЗІБА ХАМІНСКІХ ПОБАЧ З БЛАКІТНЫМІ АЗЁРАМІ



Драўляны дом на высокім падмурку ў атачэнні старых дрэў доўгія дзесяцігоддзі ўражваў сваёй прыгажосцю і шляхетнасцю. Старая сядзіба роду Хамінскіх, пабудаваная ў XVIII стагоддзі, была яскравым прыкладам народнага драўлянага дойлідства, с рысамі стыляў мадэрн і неабарока. У лепшых нямецкіх традыцыях яна была аднапавярховай, з неачэсанага бярвення, мела крыты гонтай вальмавы дах і аздоблены порцікам цэнтральны ўваход.

З цягам часу сядзібны дом патрабаваў змен і ў 1827 годзе адбылася першая рэканструкцыя, падчас якой да драўлянага порціка былі дабудаваны калоны: дзве тонкія пасярэдзіне і дзве чатырохгранныя па баках. Картуш з радавым гербам “Ліс” упрыгожваў трохвугольны франтон порціка. Пэўны час на падстрэшшы знаходзілася дамавая каплічка, якая звонку была аздоблена сімвалічнай вежачкай з гадзіннікам. Канец XIX стагоддзя быў адзначаны другой рэканструкцыяй, у 1881 годзе, падчас якой разабралі вежу і дом набыў выгляд, вядомы нам па захаваўшымся фотаздымкам.

На высокім мураваным цокалі з боку старой часткі будынка дабудавалі шырокую тэрасу, якая вызначалася бетонным парапетам з кветкавым узорам і падлогай, выкладзенай мазаічнай каляровай метлахскай пліткай. Дзеля прыемнай прахалоды ў спякотныя летнія дні над гэтым ціхім месцам адпачынку раскрывалі тэнт, металічныя стойкі ад якога захаваліся і зараз.

У 1893 годзе Хамінскія запрасілі ў Альшэва знакамітага архітэктара Тадэвуша Раствароўскага, для распрацоўкі праекта новай рэканструкцыі. Паводле гэтага праекту, да

бакавых крылаў дома былі зроблены мураваныя прыбудовы з выкарыстаннем мясцовай цэглы і дахоўкі. Пафарбаваныя ў белы колер вокны і калоны надавалі дому выразны і святочны выгляд.






**фота да 1939 года**

Больш за 200 год дом у Альшэва знаходзіўся ў валоданні адной сям’і і, дзякуючы гэтаму, яго ўнутранае аздабленне захавалася ў добрым стане амаль да 1939 года. На дадзены момант няма фотаздымкаў пакояў, але па захаваўшымся запісам можна ўявіць, як выглядаў інтэр’ер. У гасцёўні і пакоях гаспадароў можна было пабачыць інкруставаны палісандравы гарнітур XVIII ст. са столікам на танюсенькіх ножках з манаграмай Ганны

Могль (жонка Канстанціна Хамінскага), камплект мэблі ў стылі “Boule”, тры камплекты мэблі з чырвонага дрэва, два - з пазалотай ў стылю Людовіка Філіпа з арэхавага дрэва, адзін - з карэльскай бярозы.

Атмасферу шляхецкай сядзібы падтрымлівалі антыкварныя рэчы: вялікі галандскі гадзіннік, які стаяў на коміну ў галоўнай зале, дзве бронзавыя японскія вазы, крыштальныя, сярэбраныя і бронзавыя кандэлябры. Яшчэ да пачатку XX стагоддзя ў сядзібе ў добрым стане захоўваліся санкі XVIII стагоддзя ў выглядзе лебедзя, якія Аляксандр Хамінскі дараваў Віленскаму таварыству навукі.

Можна толькі ўявіць, як па вялікіх святах да стала выносілі сапраўдныя сямейныя рэліквіі: два вялікіх сярэбраных падноса і дзве пазалочаныя ўнутры цукерніцы, на якіх было выбіта шмат манаграм і гербоў.

Перажыўшы, хаця і са стратамі, турботы і віхуры 1915-1921 гадоў, дом пачаў паступова змяняцца і страчваць старасвецкі шляхетны выгляд. Печы замест самаробнай мясцовай кафлі былі абкладзены салатавай саксонскай, пры гэтым кошт рамонту адной такой пячы мог даходзіць да 500 рублёў. Сцены ў пакоях былі абклеены шпалерамі або былі пафарбаваны ў белы колер. У гасціных падлога была зроблена са старога прыгожага ўзорнага паркету, а вось у астатніх пакоях была ўжо з фарбаваных дошак.

Апасля 1939 года ўсе змянілася. Што можна было вынесці ці скрасці – было вынесена, што можна было спаліць – спалена. Сядзіба беззваротна на вачах страчвала сваю гісторыю.

Апасля Вялікай Айчыннай вайны на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў у Альшэва ў галоўным сядзібным доме месціліся: кантора Вілейскай дзяржаўнай станцыі конегадоўлі, сямігадовая школа, бібліятэка, магазін, клуб, жылы дом на 9 сямей, летнік для школьнікаў.



**фота сядзібы каля 1960-1970-х гадоў**

У 1980-я гады сядзіба была перададзена на баланс Мінскаму прыборабудаўнічаму заводу ім. Леніна для рэканструкцыі пад завадскі прафілакторый. Быццам бы і добрая справа па аднаўленню закінутай славутасці прывяла да катастрафічных вынікаў. Працы шлі вельмі марудна, цэнтральны драўляны будынак быў разабраны, каб на яго месцы пабудаваць каменны.



Але развал саюзу поўнасцю спыніў паступленне грошай на будоўлю і рэканструкцыя так і не распачалася. У разабраным выглядзе дом прастаяў да 1998 года, калі была зроблена яшчэ адна спроба рэканструкцыі, падчас якой часткова выклалі сцены з сучаснай цэглы. І зноў адсутнасць грошай прывяла да прыпынку рэканструкцыі.

І зараз ганарліва выдзяляюцца чырвоным колерам сярод старога парку руіны каменных прыбудоў. Пакуль сцены стаяць, ёсць магчымасць перанесціся на машыне часу ў былое і паспрабаваць уявіць, якое цікавае і бурлівае жыццё тут кіпела.



Галоўнае паспець, пакуль прырода поўнасцю не захапіла прывід радавой сядзібы роду Хамінскіх у краі Блакітных азёр.